# 5-га СНЕЖНЯ—ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

## РЭАЛЬНЫ ДЭМАКРАТЫЗМ

Дзень Канстытуцыі СССР — вялікае ўсенароднае свята Краіны Саветаў. У Асноўным законе нашай дзяржавы, у кожным яго артыкуле адлюстравана сапраўднае народаўладдзе, увасоблены вялікія ідэі У. І. Леніна аб сацыялістычнай дэмакратыі. Уладзімір Ільіч гаварыў, што сацыялізм — жывая творчасць народа, калі людзі працы самі ствараюць новае жыццё, самі кіруюць краінай. На ўласным вопыце рабочыя і сяляне пераканаліся, што Савецкая ўлада — гэта ўлада працоўных, улада мільёнаў. Перад усім чалавецтвам дэманструе свае перавагі сацыялістычны лад: ён стварыў і забяспечыў умовы ўсім членам грамадства для свабоднай плённай працы, для адпачынку, для бесперашкоднага доступу да ведаў, усебаковага развіцця творчых здольнасцей. Выконваючы запаветы У. І. Леніна, Камуністычная партыя ўсямерна клапоціцца аб умацаванні нашай дзяржавы, аб пастаянным удасканальванні і пашырэнні сацыялістычнай дэмакратыі. Гэта — галоўны напрамак палітычнага развіцця савецкага грамадства на шляху да камунізму. Развіццё сацыялістычнай дэмакратыі шырока і разнастайна выражаецца ва ўзрастанні ролі Саветаў, прафсаюзаў, камсамола, розных масавых арганізацый, у гаспадарчым і культурным будаўніцтве; у разгортванні вытворчай дэмакратыі на заводах, фабрыках, будоўлях; у працоўным сацыялістычным спаборніцтве. Мудрае кіраўніцтва Ленінскай партыі, якая складае ядро ўсіх дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, ляжыць у аснове развіцця сістэмы нашай сацыялістычнай дэмакратыі, з'яўляецца залогам няўхільнага руху савецкага народа да камунізму. Настойліва дабіваючыся выканання пяцігадовага плана, высокіх вытворчых паказчыкаў у ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС, савецкія людзі памнажаюць сваё грамадскае багацце, павышаюць матэрыяльны ўзровень жыцця. Яны робяць гэта з глыбокім разуменнем грамадзянскага патрыятычнага абавязку, з пачуццём паўнапраўнага гаспадара сваёй краіны. Такі рэальны дэмакратызм жыцця савецкіх людзей.



На гэтым здымку вы бачыце (злева направа): студэнтаў эканамічнага факультэта Святлану Раждзественскую, Аляксандра Грышанава і Любу Рамановіч. Усе трое — шчаслівыя, радасныя. Такія, як і многія мільёны савецкай моладзі. Яны набываюць вышэйшую адукацыю і адначасова ўдзельнічаюць у рабоце кіруючых савецкіх органаў. Святлана — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, Аляксандр — дэпутат гарадскога, а Люба — дэпутат раённага Савета дэпутатаў працоўных.


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (168) | Субота, 1 снежня 1973 г. | Газета выходзіць з верасня 1969 года раз у тыдзень | Цана 2 кап.


# НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ, НІШТО НЕ ЗАБЫТА!

## *З УРАЧЫСТАСЦЕЙ, ПРЫСВЕЧАНЫХ 30-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЯ*

Даўно адгрымела вайна. Залечаны нанесеныя раны. Вырасла новае маладое пакаленне. Але і цяпер, і праз вякі ў сэрцах людскіх жыве і будзе жыць памяць пра тых, хто прайшоў суровае выпрабаванне ў барацьбе супраць ненавіснага ворага, праявіў мужнасць і гераізм, у бітвах адстаяў незалежнасць і шчасце Радзімы.

30-годдзе вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вылілася ў вялікае свята, на якім яшчэ раз пацвердзілася існасць крылатых слоў: «Ніхто не забыты, нішто не забыта».

Студэнты нашага ўніверсітэта разам з працоўнымі горада ўсклалі вянкі на брацкія магілы воінаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, удзельнічалі ў мітынгу, які прысвячаўся знамянальнай даце.

Вечарам у мінулую суботу ва ўніверсітэце адбылася памятная сустрэча. У госці да студэнтаў прыйшоў ганаровы грамадзянін нашага горада, Герой Савецкага Саюза, былы камандуючы 11-й арміі, якая вызваляла Гомель, генерал арміі Іван Іванавіч Фядзюнінскі, былы супрацоўнік армейскай газеты Рыгор Васільевіч Кірылюк, які 26 лістапада 1943 года ўзняў на гарадской пажарнай вежы чырвоны сцяг, а таксама дэлегацыя чэшскага горада-пабраціма Чэске-Будзеёвіцэ на чале з сакратаром райкома КПЧ Уладзімірам Небазным.

На сустрэчы прысутнічалі другі сакратар гаркома КПБ Б. М. Тамашоў і намеснік старшыні гарвыканкома М. І. Скрыннікаў.

Спачатку госці сабраліся ў рэктарацэ. Рэктар доктар фізіка-матэматычных навук Б. В. Бокуць расказаў ім пра наш універсітэт, пазнаёміў з макетам будучага ўніверсітэцкага гарадка, адказаў на пытанні.

Ажыўленая размова вялася паміж чэшскімі сябрамі і прафесарам У. В. Анічэнкам. Уладзімір Васільевіч у гады Вялікай Айчыннай вайны разам з чэшскімі таварышамі партызаніў у Чэхаславакіі. Таму было вельмі цікава ўспомніць дні барацьбы супраць гітлераўскіх фашыстаў, пагаварыць пра цяперашні час.

Затым гасцей у актавай зале ўніверсітэта цёпла віталі студэнты. Вечар сустрэчы адкрыў сакратар парткома У. В. Казлоў.

У грамзапісу хвалююча прагучала паведамленне Саўінфармбюро, якое прачытаў дыктар Усесаюзнага радыё Юрый Левітан, аб вызваленні 26 лістапада 1943 года горада Гомеля.

На сцэну падымаюцца студэнткі і пад апладысменты прысутных уручаюць дарагім гасцям кветкі.

Слова прадастаўляецца ганароваму грамадзяніну нашага горада, Герою Савецкага Саюза генералу арміі Івану Іванавічу Фядзюнінскаму. Затаіўшы дыханне слухаюць студэнты яго ўспаміны. Праслаўлены палкаводзец расказвае пра неўміручы гераізм савецкага народа ў барацьбе з самым лютым і небяспечным ворагам — гітлераўскімі фашыстамі.

**(Заканчэнне на 2-ой стар.).**







На здымках: ускладанне вянкоў на брацкую магілу; студэнты—на мітынгу.

Фота А. Рудчанкі.

# У ДАПАМОГУ КУРАТАРУ

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый сярод студэнтаў універсітэта ў снежні 1973 года.

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**Чацвёртаму году пяцігодкі— ударную працу** (да вынікаў работы сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР і шостай сесіі Вярхоўнага Савета БССР).

**Адзінства правоў і абавязкаў савецкага чалавека** (да Дня Канстытуцыі СССР).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

### II. ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**Камуністычныя адносіны да працы — важнейшая маральная якасць савецкага чалавека.**

Матэрыял публікуе часопіс «Коммунист Белоруссии».

### III. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

**Падзея велізарнай важнасці** (аб візіце Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева ў Індыю).

**Сусветная сацыялістычная садружнасць — надзейная апора ў барацьбе за мір і бяспеку.**

Матэрыялы публікуе газета «Звязда».

**Буржуазная дэмакратыя: усе правы—буржуазіі, працоўным — эксплуатацыя і прыгнёт.**

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

# НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ, НІШТО НЕ ЗАБЫТА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.).

Ён зазначае той высокі маральны дух, адданасць ідэям партыі, непахісную любоў да Радзімы, якія ўласцівы для кожнага воіна і працаўніка нашай краіны. Армія і народ у той суровы час былі адзінымі, яны верылі ў перамогу і дабіліся яе.

Генерал арміі І. І. Фядзюнінскі расказваў і пра тое, як вызваляўся ад акупантаў Гомель. Відны савецкі военачальнік пажадаў нашым студэнтам заўсёды быць вернымі ідэям партыі, непахісна любіць Радзіму, заўсёды памятаць, што мы — грамадзяне Савецкага Саюза, і быць вартымі гэтага слова. Яшчэ Іван Іванавіч жадаў студэнцтву выдатнай вучобы і плённай працы для таго, каб уносіць дастойны ўклад у ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

З вялікай увагай было выслухана і выступленне Рыгора Васільевіча Кірылюка, які ўзняў над нашым горадам у незабыўны лістападаўскі дзень 1943 года сцяг вызвалення.

Ад чэхаславацкай дэлегацыі на вечары выступіў сакратар раённага Савета г. Чэске-Будзеёвіцэ Рудольф Лавічка. Ён гаварыў аб той цеснай дружбе, якая існуе паміж нашымі народамі і гарадамі-пабрацімамі, аб рашаючай ролі Савецкага Саюза ў разгроме гітлераўскай Германіі і вызваленні многіх народаў Еўропы ад векавога рабства. Сваё выступленне Рудольф Лавічка закончыў словамі:

— Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза! Няхай жыве і мацнее дружба паміж СССР і Чэхаславакіяй!

Ад імя студэнтаў універсітэта гасцей горача вітала студэнтка чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Таццяна Барадзіна.

Урачысты вечар сустрэчы з праслаўленымі ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і чэхаславацкімі сябрамі, які прысвячаўся 30-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, закончыўся канцэртам вакальна-інструментальнага ансамбля «Радзімічы».



На здымку: з генералам арміі І. І. Фядзюнінскім гутарыць рэктар універсітэта Б. В. Бокуць.

## ЭСТАФЕТА ПА ВУЛІЦАХ

У мінулую суботу наш горад нагадваў велізарны стадыён. Гэты дзень азнаменаваўся масавымі спаборніцтвамі ў гонар 30-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асабліва цікава прайшла па яго вуліцах лёгкаатлетычная эстафета. У барацьбе за памятныя прызы, якія спецыяльна вырабілі да гэтай знамянальнай падзеі фізкультурнікі завода «Цэнтраліт», удзельнічала каля 500 спартсменаў.

Лёгкаатлеты нашага ўніверсітэта былі мацнейшымі ў эстафеце сярод спартсменаў вышэйшых навучальных устаноў горада.

Узнагароды пераможцам спаборніцтваў уручыў галоўны суддзя эстафеты, былы член Ваеннага Савета Беларускага фронта, ганаровы грамадзянін Гомеля генерал-лейтэнант Канстанцін Фёдаравіч Цялегін.

## ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У дзень 30-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на гісторыка-філалагічным факультэце адбылася студэнцкая тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная гэтаму знамянальнаму юбілею. Будучыя педагогі з вялікай цікавасцю слухалі ўспаміны Івана Паўлавіча Ахматава, які ўдзельнічаў у фарміраванні Маскоўскай дывізіі апалчэння, вызваляў Гомель ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Са змястоўным дакладам «Гомель у гады Вялікай Айчыннай вайны» выступіла трэцякурсніца Зінаіда Зайцава. Аб гераічных справах гомельскага падполля ў гады фашысцкай акупацыі расказаў студэнт чацвёртага курса Леанід Машэўскі.

Канферэнцыя прайшла ў святочнай абстаноўцы з вялікай карысцю для яе ўдзельнікаў.

**Н. СІМАНЕНКА,**
**студэнтка 1V-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## «АГЕНЬЧЫК» У ІНТЭРНАЦЕ

У мінулую нядзелю вечарам у інтэрнаце № 2 адбыўся «Агеньчык», прысвечаны 30-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да сябе ў госці моладзь запрасіла ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Героя Савецкага Саюза падпалкоўніка запасу Р. К. Дзенісенку, палкоўніка запасу, выкладчыка кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму Я. Р. Ермалаева, падпалкоўніка запасу У. Н. Пігунова, якія расказвалі аб гераічным подзвігу савецкага народа ў барацьбе супраць гітлераўскіх акупантаў, аб вызваленні Гомеля.

Для дарагіх гасцей студэнты паказалі невялікі канцэрт, у праграму якога ўвайшлі сучасныя песні і песні часоў Вялікай Айчыннай вайны.

## САЛІДАРНАСЦЬ З МОЛАДДЗЮ ЧЫЛІ

Уся савецкая моладзь горача адклікнулася на рашэнне ЦК ВЛКСМ аб правядзенні месячніка салідарнасці з народам і моладдзю Чылі.

Нядаўна ў газеце «Комсомольская правда» быў апублікаваны «Зварот да моладзі свету» Генеральнага сакратара Камуністычнай Моладзі Чылі Гладзіс Марын. У гэтым дакуменце, які нельга чытаць без хвалявання, уся моладзь свету прачытала пра крывавую восень у Чылі. Юнакі і дзяўчаты планеты блізка да сэрца ўспрынялі заклік моладзі змагаючайся краіны да баявой салідарнасці.

У адказ на гэты зварот, студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта нашага універсітэта правялі мітынг салідарнасці з чылійскай моладдзю. Мітынг адкрыў і зачытаў «Зварот да моладзі свету» прэзідэнт Клуба інтэрнацыянальнай дружбы ГДУ Ігар Нямкевіч. Затым хвалюючыя радкі апошняга верша чылійскага паэта-героя Віктара Хары прачытала студэнтка Святлана Кісялёва. Ад імя студэнтаў сваіх курсаў аб салідарнасці з моладдзю і народам Чылі заявілі Антаніна Ксянзова і Валянціна Старакожава. Аб незабыўных днях на Х Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне і сустрэчах з чылійскай дэлегацыяй расказаў выпускнік механіка-матэматычнага факультэта нашага ўніверсітэта Уладзімір Семянчук.

Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой гаворыцца: **«Першая на лацінаамерыканскім мацерыку краіна з народным урадам у выніку падкопаў унутранай рэакцыі і міжнародных імперыялістычных колаў падвергнута жорсткаму тэрору здраднікаў нацыі.**

**Забіты вялікі сын чылійскага народа — першы ў гісторыі Лацінскай Амерыкі народны прэзідэнт Сальвадор Альендэ. Забітыя і па-зверску закатаваныя тысячы чылійскіх патрыётаў. Тысячы кінуты ў турмы і канцэнтрацыйныя лагеры.**

**Але крывавым тэрорам не зламаць волю працоўнага народа Чылі! У разгар жорсткіх рэпрэсій ён з'ядноўвае свае шарэнгі.**

**Гераічнаму народу Чылі, чылійскай моладзі мы аддаем свае галасы салідарнасці!»**

Цяпер на факультэце ідзе збор подпісаў, якія разам з рэзалюцыяй мітынгу будуць перасланы ў Камітэт маладзёжных арганізацый СССР для перадачы прадстаўнікам чылійскай моладзі.

Студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта заклікаюць усіх выхаванцаў універсітэта пераймаць іх прыкладу.

Няхай жыве і мацнее антыімперыялістычная салідарнасць!

**(Прэсбюро Клуба інтэрнацыянальнай дружбы).**

## ВЫКАНАН ПЛАН АДЗІНАЦЦАЦІ МЕСЯЦАЎ

**Работнікі прамысловасці Беларускай ССР, шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана 1973 года — трэцяга, рашаючага года дзевятай пяцігодкі, датэрмінова, 27 лістапада, выканалі план адзінаццаці месяцаў па рэалізацыі прадукцыі і выпуску большасці важнейшых відаў вырабаў.**

**Паводле папярэдніх даных, прырост прамысловай вытворчасці ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 10,5 працэнта, прадукцыйнасць працы павялічылася амаль на 8 працэнтаў. Тры чвэрці прыросту прадукцыі атрымана за кошт павышэння прадукцыйнасці працы.**

**Паспяхова выконваюцца прынятыя на 1973 год сацыялістычныя абавязацельствы па звышпланаваму выпуску трактараў, аўтамабіляў, сіласаўборачных камбайнаў, мінеральных угнаенняў, аўтамабільных пакрышак, хімічных валокнаў, драўнінна-валакністых пліт, халадзільнікаў бытавых, тканін, трыкатажных, кандытарскіх і іншых вырабаў.**

**Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне пры Савеце Міністраў БССР.**

## ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ

Савецкі спецыяліст сёння — гэта чалавек творчага пошуку. У сувязі з гэтым пастаўлена задача ўсімі сродкамі садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей студэнтаў.

Выступаючы на ІІІ-ай агульнаўніверсітэцкай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі, рэктар прафесар Б. В. Бокуць адзначыў, што асобу студэнта вызначаюць: па-першае,— вучоба, па-другое,— навуковая работа і, нарэшце,— грамадская дзейнасць. Барыс Васільевіч указваў на тое, што кожны студэнт павінен імкнуцца да таго, каб да заканчэння вну мець друкаваныя працы.

Улічваючы патрабаванні часу, на сваім факультэце мы дамагаемся ўсямернага развіцця студэнцкай навуковай творчасці. За мінулы навучальны год нашы студэнты апублікавалі шэсць навуковых артыкулаў. Студэнтка В. Цыкунова сумесна з к. м. н. Л. А. Мацвіенка змясцілі сваю работу ў зборніку матэрыялаў рэспубліканскай канферэнцыі па праблеме «Трэніраванасць і сардэчна-сасудзістая сістэма». Тры артыкулы студэнтаў М. Бухарава, Л. Чарнова, А. Макеева і к. м. н. Л. А. Мацвіенка апублікаваны ў зборніку матэрыялаў І-ай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ і ў зборніку матэрыялаў Усесаюзнай канферэнцыі па спартыўнай медыцыне.

На студэнцкую навуковую канферэнцыю, якая праходзіла ў Навасібірску, былі запрошаны Е. Кавязіна і А. Макееў. Тэзісы іх дакладаў апублікаваны ў зборніку гэтай канферэнцыі.

Хочацца выказаць упэўненасць у тым, што студэнты факультэта фізвыхавання дасягнуць яшчэ больш значных поспехаў у навукова-даследчай рабоце.

**А. МАКЕЕЎ,**
**старшыня СНТ факультэта фізвыхавання, студэнт ІV-га курса.**

## ЖЫЦЬ ПА-ЛЕНІНСКУ

Вобраз вялікага Леніна вечна жыве ў яго творах: артыкулах, кнігах, прамовах. Чытаючы працы Леніна, можна прасачыць за сутнасцю і рухам яго думкі, за жалезнай логікай і выключнай дынамікай мыслення.

У. І. Ленін неаднаразова ўважліва разглядаў пытанні, звязаныя з жыццём моладзі. Ён вучыў нашу моладзь мэтанакіраванасці, яснаму разуменню сваёй мэты і задач.

Пра ўсё гэта гаварылі камсамольцы нашай групы Г—32 на Ленінскім уроку, які праводзіўся па тэме «Жыць, вучыцца і змагацца па-ленінску». Гэты ўрок прысвячаўся XVII з'езду ВЛКСМ і слаўнаму юбілею — 50-годдзю з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

На ўроку ішла гаворка пра VII з'езд камсамола, які адбыўся ў жалобным 1924 годзе, студэнты ўспаміналі маладых гамяльчан, якія са зброяй у руках змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Цяпер перад нашым юнацтвам стаяць новыя пытанні: «Чым ты жывеш, сённяшні камсамолец?», «Які твой асабісты ўклад у імя светлай будучыні?».

Мы, камсамольцы 70-ых, атрымалі тое, пра што нашы дзяды і бацькі толькі марылі — шырокія правы, высокі ўзровень жыцця, багатую спадчыну духоўнай і матэрыяльнай культуры. І сёння мы ўсведамляем, што наша задача — быць у першых шарэнгах барацьбітоў за новае жыццё.

Ленінскі запавет моладзі «вучыцца камунізму» быў, ёсць і застаецца баявым лозунгам усіх пакаленняў савецкай моладзі.

Усе гэтыя пытанні былі пераканаўча і змястоўна асветлены ў выступленнях Раісы Коржавай, Віктара Баброўнічага, Святланы Сцяпанавай, Мікалая Алейніка, Уладзіміра Шчарбіны.

Камсамольцы групы, ідучы насустрач XVII з'езду ВЛКСМ, прынялі сацыялістычныя абавязацельствы, вынікі выканання якіх вырашана падвесці ў дзень адкрыцця з'езда.

У нашай памяці надоўга застанецца сустрэча з Таісіяй Андрэеўнай Палянічка, якая ўступіла ў рады камсамола ў 1921 годзе, а з 1925 з'яўляецца членам Камуністычнай партыі. Яе жыццё, вельмі цікавыя ўспаміны зрабілі на ўсіх нас вельмі глыбокае ўражанне. З Таісіяй Андрэеўнай мы вырашылі падтрымліваць цесную сувязь.

**З. ЗАЙЦАВА,**
**камсорг групы Г-32 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Выступаюць члены літаратурнага аб'яднання*




## ВЫСТУПІЛІ Ў ШКОЛЕ

Нядаўна члены ўніверсітэцкага літаратурнага аб'яднання былі гасцямі вучняў гомельскай СШ № 40. На сустрэчы свае вершы чыталі Мікола Краўчанка, Анатоль Зэкаў, Сямён Шыкун, Святаслаў Крупенька, Аляксандр Дуброўскі, Алесь Лозка. Выступленне маладых аўтараў выклікала ў прысутных вялікую цікавасць. Старшакласнікі пажадалі падтрымліваць з літаратурным аб'яднаннем універсітэта цесную сувязь, у памяць сустрэчы падарылі названым пачынаючым паэтам кнігі.

Віктар ЯРАЦ

## САЛОДКІ ДЫМ

Вясновы дым, што кружыць
галаву,
павольна адплывае над зямлёю,
дзе, веру я, што некалі прыйду,
прыйду здалёк былінкай палявою.
Закружыцца пялёсткаў белы рой
і знікне дым развеяны ў зеніце,
і нехта нахінецца нада мной
на сцежцы, што бяжыць
у жоўтым жыце.
Заб'ецца ў небе сэрца жаўруком
і паплывуць з аблокамі над краем
мелодыі абуджанай ракой
над пыльным, полем, над гаючым
гаем.
І я прыйду былінкай з небыцця
паслухаць голас ранішні
жанчыны,
І я скажу: няма жыццю канца,
калі ёсць дым, салодкі дым
Айчыны...

Мікола КРАЎЧАНКА

## МАХЛЯР-КАЛЯНДАР

То ж трэба, махлярства на
свеце,
Ну праўда, якісьці кашмар...
— Таварышы, хто надувае?
Звычайны сцянны каляндар.
Спачатку я сам не паверыў,
Аж бачу, ну што за бяда:
Учора вісела субота,
А сёння, ты глянь — серада!
Я знесці падману не здолеў:
— Дык што ж ты, такі ды
сякі?
Махлярыць? Паганы
бухгалтар.
Ды хто ты, урэшце, такі?
Ён, праўда, маўчаў —
ані гука,
Я ж так усхадзіўся, насеў,
Што, бедны, за той серадою
Мо з тыдзень, глядзі,
чырванеў...
І Вам, я таварышы, раю,
Які б каляндар Ваш не
быў —
За ім Вы ды ўсё ж
назірайце,
Каб дзён дарагіх не губіў.

★

Алесь ЛОЗКА

## БАЛАДА АБ ДРЭВЕ

Часценька прыходжу адзін
я сюды
На лебедзяў белых дзівіцца,
На кацер, што ў хвалях
празрыстай вады,
Як сонца ў рэчку садзіцца.

У парку цяністым,
у нейкім кутку
(Паводле сівога падання),
Дзе чулася толькі зязюлі
«ку-ку»,
Хаваецца дрэва кахання.

Падобны на сэрца, ягоны
лісты
Каханне прыносілі людзям.
Як знойдзеш часінай
лісток гэты ты,
Каханнем акрылены будзеш.

Ідзіце ў парк, дарагія сябры,
Жадаю шчаслівых
спатканняў!
Пакуль яшчэ сэрца не гасне,
гарыць,
Вы знойдзеце дрэва
кахання.

★

Аляксандр ДУБРОЎСКІ

* * *

Апошняй сваркі горкі смак
Яшчэ не выветрылі губы,
А мы будуем усяляк
Спатканняў новенькія
зрубы.

Кахання хісткія масткі
Падводзім к гэтым
пабудовам
І шчасця кволыя расткі
Гадуем шчыра цёплым
словам.

І вуснаў хмельнае віно
Мы п'ём, бы нектар,
ў цёмным парку...
Ну, а за намі зноў даўно
Другая хітра сочыць сварка.

*АПАВЯДАННЕ*

Валерый ПАРКОЎСКІ.

## ЛЮДСКАЯ ПАМЯЦЬ

У СВАЮ родную вёску Весялоўку, што на Палессі, дзядзька Ягор вяртаўся з вайны без нагі. За доўгія ваенныя гады засумаваў ён па роднай зямлі, па сям'і. Хацелася як мага хутчэй убачыць жонку, дзяцей.

На месцы вёскі Ягор убачыў толькі абгарэлыя каміны.

Пра жонку і дзяцей — ніякай чуткі.

Ягор не пайшоў нікуды. Ды і куды яму было ісці? Навокал свая, родная зямля, апаленая вайной. Гора — амаль у кожнай сям'і.

Спярша Ягор жыў у зямлянцы. Пазней калгаснікі дапамаглі паставіць хаціну. Пра сваю сям'ю даведаўся ад бабулі Матроны, якая адзіная з аднавяскоўцаў засталася ў жывых.

— На цябе, Ягор, прыйшла пахавальная яшчэ ў 41-ым, — прыпаміналa былая суседка. — Тады ж твой старшы, Ігнат, пайшоў за бацьку помсціць. Не ўтрымала яго твая Насця. А можа яно і да лепшага. Усіх астатніх жывымі спалілі нехрысці. Ганульцы тваёй, дык яшчэ і трох не было... І Колька згарэў... Усіх чыста знішчылі, гадаўё...

Абліваючыся горкімі слязьмі, бабуля працягвала:

— Я ў той дзень дык у другой вёсцы была. Хадзіла за бульбай да сваячкі. Вярнулася — ні двара, ні кала. Усё агнём пайшло. — Ад гора ламаючы свае рукі, бабуля загаласіла на ўвесь голас: — Згарэла, Ягор, і мая дачка з гадавалым дзіцём...

Калгаснікі адносіліся да Ягора з павагай, часцяком прыходзілі за парадай. Выбралі яго членам калгаснага праўлення, неаднаразова ў школу запрашалі, каб пра вайну расказаў. Толькі расказваць пра яе Ягор не любіў. Пры ўспамінах увесь час болем напаміналa страчаная на Каўказе нага, перад вачыма, нібы з магілы, узнімаўся той юнак-аднапалчанін, што быў так падобны на яго Ігната. Гэта ён з крыкам: «Назад, бацька!» адштурхнуў Ягора і з супрацьтанкавай гранатай кінуўся пад гусеніцы фашысцкага танка. Вышыню ўзялі, а юнага героя нават не паспелі, як след, пахаваць.

— Эх, — цяжка ўздыхнуў Ягор, — я ж вінаваты ў яго смерці. Навошта наперад адпусціў... — А падумаўшы, дадаў: — Каб не Мішка, уся рота накрылася б.

Прыпамінаючы гэты эпізод, Ягор звяртаўся ў думках і да свайго сына Ігната, які таксама яшчэ зусім падлеткам пайшоў помсціць за бацьку, ды так і не вярнуўся. Аднак у душы Ягора цяплілася спадзяванне, што яго Ігнат не загінуў, дзесьці жывы, і яны абавязкова сустрэнуцца.

Чым часцей Ягору нагадвалася ліхалецце вайны, тым больш яго непакоіла думка пра гібель юнага аднапалчаніна: «Сірата ж быў, і ўспомніць пра яго няма каму».

Ягор цвёрда вырашыў паехаць на тое месца, дзе загінуў Міхась, зрабіць юнаму герою магілу. Але добра сказаць паехаць, думаў Ягор. Мінула ўжо больш за 29 гадоў. Паспрабуй цяпер знайдзі тое месца. Але нейкі ўнутраны голас неадступна дапытваўся: «Хто ж, як не ты, Ягор, успомніць пра Міхася? Хто прыйдзе яму аддаць нізкі паклон? Будзе магіла, любы прахожы супыніцца і шапку здыме. І кветкі прынясуць».

— Так, трэба ехаць, і як мага хутчэй, — сам сябе прыспешвае Ягор, прымяркоўваецца, як сабраць грошай на дарогу і агароджу для магілы.

Доўга выбіраў Ягор спадручны момант, перш чым зайсці да старшыні калгаса і папрасіць водпуск. І да таго дня старшыня яшчэ не бачыў Ягора такім прынараджаным. Чысценька вымытая гімнасцёрка са старшынскімі пагонамі, два ордэны Славы і ордэн Чырвонай Зоркі, каля дзесятка медалёў зіхацелі на грудзях былога франтавіка. На ўцалеўшую нагу Ягор абуў начышчаны да бляску хромавы бот.

— Не інакш як на вяселле сабраўся, Ягор Кірылавіч, — усміхнуўся старшыня.

— На пахаванне, — рашуча абарваў Ягор.

— Ну, што здарылася, выкладвай, Кірылавіч, — перайшоў на сур'ёзны тон старшыня. — Сам ведаеш — уборка. Конюх — во як трэба, — правёў рукою па горлу старшыня.

— Не магу я зімою Іван Панцялеевіч. Цяпер хутчэй знайду тое месца, дзе загінуў мой Міхасёк. — І Ягор падрабязна расказаў, навошта яму водпуск.

— Эх ты, — з дакорам паглядзеў на Ягора старшыня, — калгасам жа нам прасцей. Чаго ж ты дагэтуль маўчаў? І піянеры табе дапамаглі б! Калі так — едзь. Толькі не забудзь, зайдзі ў бухгалтэрыю. Там прэмію табе афармілі. Яшчэ што-небудзь прыдумаем. Вернешся — больш канкрэтна паталкуем, — сказаў старшыня. А на наступны дзень сам адвёз Ягора на вакзал.

Даўно ўжо так не хваляваўся Ягор, як цяпер, у дарозе. Вось ужо ў каторы раз ён выйшаў у тамбур, скруціў самакрутку, задуменна зацягнуўся дымам.

Ноччу яму не спалася. Варочаўся з боку на бок ды так і не здолеў заснуць. Ці то не прывык да цягніка, ці то не даў супакоіцца пранізлівы юнацкі голас, які ўвесь час звінеў у вушах: «Назад, бацька!».

Прыехаў Ягор раніцай. Спачатку ажно разгубіўся. Ён апынуўся ў вялікім горадзе. Шмат людзей і ўсе кудысьці спяшаюцца. «У каго спытаць, хто дапаможа?» — у думках непакоіўся селянін з Палесся.

— Таварыш старшына, дазвольце звярнуцца! — нечакана гэтыя словы аклікнулі Ягора. Ён імгненна павярнуў галаву і ўбачыў перад сабою высокага, моцнага складу грузіна ў міліцэйскай форме.

Ягор, як змог, растлумачыў прычыну свайго прыезду.

— Знойдзем, бацька, магілу вашага героя, не хвалюйцеся, — заспакоіў міліцыянер. Ён паклікаў таксіста і растлумачыў куды ехаць.

Калі выехалі за горад, Ягор крыху прыйшоў у сябе, загаварыў:

— Калісь ваяваў тут. І нагу тут згубіў. А цяпер, бач, не пазнаць гэтыя мясціны. Усё забудавалася, усюды асфальт. Як быццам і не было тут вайны.

Да той вёскі, дзе стаяла рота, у якой служыў Ягор, ехалі мо больш за гадзіну. І хоць яна зусім перабудавалася, Ягор пазнаў яе адразу.

— Вось тут мы стаялі, тут! — ажывіўся былы франтавік.

Шафёр спыніў таксі, запытаў:

— Далей самі пойдзеце, ці праводзіць?

— Не, не! Тут я ўжо, браток, сам, — са шчырай удзячнасцю адказаў Ягор і працягнуў таксісту грошы:

— Дзякуй, што падкінуў!

— Ды што ты надумаў, бацька! Навошта крыўдзіш? — адвёў таксіст Ягораву руку з грашыма. — Хавай у кішэню. Яшчэ і самому спатрэбяцца.

Таксіст з жалем паглядзеў на Ягораў пратэз, заўважыў:

— Ты, бацька, ужо за ўсё расплаціўся. Цяпер ведай, на Каўказе любы дом — твой дом. Запішы і мой адрас. Дарагім госцем будзеш.

Ягор запісаў адрас, яшчэ раз падзякаваў за чуласць і павольна падаўся ў горы. Чым вышэй падымаўся Ягор, тым мацней білася сэрца.

Вось і паварот. Ягор спыніўся, рукавом выцер з ілба пот і ўпэўнена пакрочыў наперад. З-за скалы яго вочы, нібы полымя саствала танка, асляпіла яркае сонца. Ягор абмёр. На тым самым месцы, быццам фантастычная ракета, стаяў абеліск з чырвонай зоркай. Ля яго падножжа на каменных плітах ляжалі свежыя ружы, вянкі. Ягор ўзняў галаву і прачытаў: «Невядомаму салдату, аддаўшаму жыццё за свабоду і шчасце Радзімы».

З Ягоравых вачэй пырскнулі скупыя мужчынскія слёзы. Скрозь іх Ягор толькі і вымавіў: «Вось якая яна, людская памяць», — і надоўга ўсёй сваёй постаццю прыпаў да мармуровага абеліска.

✦

**У зімовым спакоі застылі бярозы.**

Фотаэцюд **А. Рудчанкі.**

✦



Міхась КАМАРОЎСКІ

## ПОКЛІЧ

Пазнікалі бялюткія зоркі.
Месяц жоўты збялеў на
зары.
Толькі покліч адной
перапёлкі
Не сціхае ля сіняй ракі...

О, каханне маё, адгукніся!
Дзе знайсці цябе, шчасце
маё?..
Мне чутно, як на бэзава
лісце
Месяц сыпле адно серабро.

Ніна КАЗЮЛІНА

Дети любят сахар,
А олени — соль.
Землю любит пахарь,
А моря — Ассоль.

* * *

Я люблю дорогу,
Где легли следы
От моей тревоги
До твоей судьбы.

Пётр РАМАНЕНКА

## СНЕЖИНКИ

Снежинки тают на твоих
ладонях,
Ты ловишь их, кругом
кружит метель.
И ветер без билета на
вагоне
Готовит к ночи пышную
постель.

Снежинки тают на твоих
ладонях,
Ты ловишь их, а я ловлю
твой взгляд.
И хочется остаться
на перроне,
Где только ты, да поезда
стоят.

